Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

ЯК ПАЎПЛЫВАЦЬ НА ЯКАСЦЬ СВАЙГО НАСЕННЯ

Рынак нас не песціць. Насенне ўсё часцей проста не ўсходзіць, а часам замест усходаў патрэбных раслін вырастае якое-небудзь пустазелле, ужо не кажучы пра сартавую прыналежнасць. Так, сёлета, пасеяўшы адзін сорт кабачкоў, я ў выніку атрымала на кожным кусце розныя плады — і белыя, і зяленыя, і нават рабыя. І гэта далёка не адзінкавы выпадак. Як жа быць? Выйсце адно — вырошчваць сваё насенне.

Чым далей, тым лепш

Ёсць у насенняводстве такое паняцце, як перакрыжаванаапыляльныя культуры. Іх нельга саджаць блізка адну да адной. Так, розныя сарты морквы, рэпы, рэдзькі, капусты рэкамендуюць высаджваць не бліжэй чым 300—500 метраў адзін ад аднаго. Тобок у сябе на ўчастку можна вырасціць не больш за адзін сорт. Вам трэба выбраць такі сорт, які падабаецца больш за іншыя. Калі пасадзіць на насенне два сарты, то яны пераапыляцца адзін з адным, і што з такіх гібрыдаў вырасце, не скажа ніхто.

Дарэчы

Памідорам такія складанасці не патрэбныя — яны апыляюцца самі, на стадыі бутонаў, гэта значыць, калі кветкі раскрываюцца, яны ўжо апыленыя. Таму кожны агароднік можа сабраць у сябе на ўчастку цэлую калекцыю сартоў памідораў.

Сваё насенне таматаў

Каб памідоры былі асабліва ўраджайныя, на насенне трэба пакідаць іх

з першай ці другой гронкі, адбіраючы хай не самы буйны, але самы тыповы для сорту плод.

Іх да поўнай спеласці вытрымліваюць на кусце, потым здымаюць і даспяваюць на сподачку — на падаконніку. Калі памідор размякчыцца, яго размінаюць і вылучаюць насенне, якое трымаюць у вадзе для зброджвання на працягу 1-3 сутак. Калі вадкасць бродзіць, насенне прамываюць, вымываючы мякаць. Чыстае насенне сушаць і захоўваюць у пакеціках з тканіны або папяровых.

Сваё насенне агурка

Звычайна на насенне пакідаюць выпадковыя агуркі-перарасткі, якія своечасова не сабралі. Гэта не заўсёды найлепшыя асобнікі. Нашмат лепш спецыяльна адабраць на насенне роўны і прыгожы агурок з усімі прыкметамі сорту. Да канца жніўня яго трымаюць на кусце. І толькі потым зрываюць і адпраўляюць на падаконнік, дзе трымаюць да размякчэння, пасля чаго аддзяляюць насенне ад мякаці і прасушваюць.

Свежае насенне агуркоў лепш не сеяць, будзе шмат пустацветаў. Найлепшы ўраджай атрымліваецца з насення пасля трэцяга года захоўвання, а ўсходжасць яно захоўвае да 6-7 гадоў.

Сваё насенне караняплодаў

Першы год мы вырошчваем ураджай і адбіраем, напрыклад, найлепшыя дзве-тры морквы. На другі год саджаем іх на насенне, захоўваючы зімой караняплоды, абмазаныя глінай. Насенне з іх атрымаецца шмат. Таму можна павысіць якасць, захоўваючы толькі цэнтральны кветканос з асабліва паўнаважкім насеннем.

Спелае насенне ў морквы светла-карычневага колеру і лёгка аддзяляецца ад кветканосаў. А вось насенне рэдзькі, рэпы, дайкона можна звязаць у венічкі і пакінуць сушыцца. Добра прасушанае насенне доўга захоўваецца без страты якасці.

Кабачкі і гарбузы

З імі ўсё проста: узімку пры гатаванні выбіраюць з пладоў самае буйное насенне, сушаць і ссыпаюць у пакеты.

Кроп, салата, гарчыца, кінза, кмен

— усе яны цвітуць у год пасеву, і насенне можна збіраць па меры паспявання. Выбіраюць на насенне цэнтральныя суквецці, а ў іх крайняе, самае буйное насенне. Яно самае ўраджайнае.

Перац

Трэба своечасова сабраць насенне, да таго як плод пачне моршчыцца, але і збіраць зялёным яго нельга. А для своечасовага збору трэба ведаць, якая афарбоўка пладоў у біялагічнай спеласці, і, арыентуючыся на яе, правесці выманне насення. Застанецца толькі яго як след прасушыць і адправіць на захоўванне.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.12	20.07	13.55
Віцебск —	5.59	20.00	14.01
Магілёў —	6.02	19.58	13.56
Гомель —	6.02	19.51	13.49
Гродна —	6.28	20.22	13.54
Брэст —	6.23	20.31	14.08

Месяц

Поўня 26 жніўня. Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Дзяміда.*
К. *Сабіны, Віталя, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

29 ЖНІЎНЯ

У краіне

1890 год — нарадзіўся (Латвія) Вільгельм Георгіевіч Кнорын, партыйны і дзяржаўны дзеяч, гісторык, публіцыст, літаратурны крытык, доктар гістарычных навук (1935). У гады Першай сусветнай вайны ваяваў на Заходнім фронце. Адзін з кіраўнікоў барацьбы за савецкую ўладу ў Беларусі. У 1917 годзе сакратар Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, член ВРК Заходняй вобласці і фронту, адзін з рэдактараў газеты «Звязда». З 1919 года — сакратар ЦК КП(б) Літвы і Беларусі. 31 ліпеня 1920 года ад імя КП(б)ЛіБ падпісаў Дэкларацыю аб абвяшчэнні незалежнасці Беларускай ССР. У 1927—1928 гадах — першы сакратар ЦК КП(б)Б. Аўтар прац па гісторыі партыі і літаратурна-крытычных артыкулаў. У 1938 годзе рэпрэсаваны, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1955-м. Яго імем названа вуліца ў Мінску.

1897 год — галава Мінска выдаў пастанову, якая прадпісвала веласіпедыстам правілы язды па горадзе: не палохаць коней, ездзіць па правым баку вуліц і праездаў, не ехаць хутка, мець на веласіпедзе замацаваны нумар, выдадзены гарадской управай.

У свеце

1885 год — нямецкі вынаходнік Готліб Даймлер запатэнтаваў першы матацыкл. Інжынер Даймлер з 1872 года займаўся стварэннем рухавіка ўнутранага згарання. У 1885 годзе яго рухавік прайшоў стадыю даследаванняў і быў гатовы да выкарыстання. Заставалася толькі знайсці прыдатную машыну для яго ўстаноўкі. Самым простым варыянтам аказалася выкарыстоўваць для гэтага веласіпед, які 29 жніўня 1885 года і быў запатэнтаваны як «павозка для верхавой язды з газавым рухавіком». Праўда, сам вынаходнік так і не паспеў увасобіць сваю ідэю ў жыццё, гэта зрабіў яго сын — Адольф Даймлер. Першы вырашыў пракаціцца Вільгельм Майбах, блізкі сябар Даймлераў. Драўляны прадзядуля матацыкла адправіўся ў дарогу з хуткасцю 12 км/г. Вяртання яго чакалі доўга, і вось нарэшце Майбах з'явіўся, заглушыў матор, паставіў матацыкл на месца і ўздыхнуў: «Гэта не машына, гэта — косцедрабілка. Я вас віншую!»

1918 год — выдадзены дэкрэт, у адпаведнасці з якім Савецкі ўрад адмаўляўся ад дамоваў і актаў Расійскай імперыі аб падзеле Рэчы Паспалітай.

1938 год — пастановай СНК СССР у Савецкім Саюзе ўведзена завочная вышэйшая адукацыя. Былі вызначаны наменклатура спецыяльнасцяў для сістэмы завочнай адукацыі і сетка самастойных завочных ВНУ. Гэтай жа пастановай уводзілася ва ўсіх завочных ВНУ і аддзяленнях курсавая сістэма навучання і абавязковая здача ўсіх іспытаў і залікаў, а завочнікам даваліся дадатковыя аплатныя адпачынкі па месцы работы.

1949 год — першая савецкая атамная бомба, якая з'яўлялася копіяй амерыканскай плутоніевай бомбы, узарванай над Нагасакі, паспяхова прайшла выпрабаванне на Сяміпалацінскім палігоне. Кіраўнікам работ Лаўрэнцію Берыі і Ігару Курчатаву былі нададзены званні Ганаровы грамадзянін СССР.

УСМІХНЕМСЯ

...І вось, на дванаццатым годзе рамонту яго забіла суседзямі.

— Дарагая, твой боршч стаў яшчэ больш смачным! Што ты з ім зрабіла?

— Зварыла.

Калі дзяўчына кажа, што для яе самае галоўнае ў хлопцы пачуццё гумару, яна мае на ўвазе, што яе прыгожы і багаты хлопец павінен яшчэ ўмець добра жартаваць.

Адзін салдат — другому:

— Не спрачайся са старшыной, што Зямля круглая.

— А чаму?

— Раўняць прымусіць.

Моцная сям'я — гэта калі яна прыгожая і ў футры, а ён увесь час трошкі вінаваты.

— Што перашкаджае вам глядзець на жыццё цвяроза?

— Жанчыны і сябры.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2996.

Нумар падпісаны ў 19.30 28 жніўня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12